ЗАЦВЯРДЖАЮ
Начальнік аддзела культуры
Гродзенскага гарадскога
выканаўчага камітэта
_____Д.Р.Чарняк
«____» _____2022 г.

ІНСТРУКЦЫЯ
аб правядзенні адкрытага гарадскога
конкурсу дэкаратыўна-прыкладной
творчасці «Велікодная вярба»

1. Агульныя палажэнні

Дадзеная інструкцыя ўсталёўвае парадак арганізацыі, правядзення і падвядзення вынікаў адкрытага гарадскога конкурсу дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Велікодная вярба» (далей –Конкурс).

Арганізатарам Конкурсу з'яўляецца аддзел культуры Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта і філіал «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Агульнае і творчае кіраўніцтва Конкурсам ажыццяўляе арганізацыйны камітэт (дадатак 3).

2. Мэты і задачы Конкурсу

- адраджэнне, захаванне і папулярызацыя традыцыйнай культуры Гарадзеншчыны па вырабу велікодных вербаў і выцінанкі;
- папулярызацыя элементаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны Гарадзеншчыны;
- павышэнне цікавасці да традыцыйнай культуры Гродзенскай вобласці, пашырэнне ведаў аб народных традыцыях, святах;
- садзейнічанне творчай самарэалізацыі таленавітых майстроў, дзяцей і моладзі;
- фарміраванне базы таленавітых майстроў, папулярызацыя іх творчасці.

3. Умовы і парадак правядзення Конкурсу

Удзельнікамі Конкурсу могуць быць майстры народнай творчасці раённых Дамоў (цэнтраў) рамёстваў, аддзелаў традыцыйнай культуры раённых цэнтраў культуры і народнай творчасці, рамеснікі, навучэнцы ўстаноў адукацыі, іншыя аматары дэкаратыўна-прыкладной творчасці (без узроставых абмежаванняў).

Конкурс праводзіцца па наступным намінацыям:

- традыцыйная выцінанка: «Дрэва Жыцця», «Букет» з выявамі птушак, звяроў, людзей і інш;
- сучасная выцінанка: дэкаратыўныя сюжэтныя кампазіцыі, прадметы побыту, аздобленая выцінанка, паштоўкі і інш.
- традыцыйная вярба: галінкі вярбы, дэкарыраваныя выключна прыроднымі матэрыяламі.
- сучасная вярба: галінкі вярбы, дэкарыраваныя сучаснымі матэрыяламі (штучныя кветкі, стужкі, карункі і г.д.);
- інсталяцыя «Велікоднае яйка» (памер- 1-1,5 метра).

Да удзелу ў Конкурсе прымаюцца індывідуальныя работы дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва як традыцыйнага, так і сучаснага накірунку, выкананыя ў розных тэхніках і з розных матэрыялаў.

Даты правядзення: **з 1 па 20 красавіка 2022 года.**

Работы ўдзельнікаў будуць прадстаўлены на выніковай выставе, якая адбудзецца 22 красавіка падчас правядзення мерапрыемства «Свята вярбы і выцінанкі».

4.Тэрмін падачы заяўкі на ўдзел

Заяўкі на ўдзел у Конкурсе дасылаюцца на электронны адрас цэнтра рамёстваў «Спадчына» gr.nasledie@mail.ru да 18.04.2022 года (дадатак 2).

5.Патрабаванні да конкурсных работ

На Конкурс прымаюцца работы, афармленыя наступным чынам: прозвішча і імя ўдзельніка, назва намінацыі, назва работы.

Конкурсныя работы ў адпаведнасці з заяўкай неабходна даставіць у цэнтр рамёстваў «Спадчына» (г. Гродна вул. Рэйманта, 12) не пазней 18.04.2022 года.

Даведкі па нумарах тэлефона: 8(0152) 68 38 20, 68 38 21, 68 38 23, маб. +375 44 7440883

Дасылаючы сваю працу на Конкурс, аўтар дае арганізатарам права на выкарыстанне прадстаўленых матэрыялаў (размяшчэнне фотаздымкаў конкурсных работ ў сетцы Інтэрнэт, у фотагалерэі і інш.)

6. Крытэрыі ацэнкі

Пры ацэнцы конкурсных работ журы ўлічвае:

- мастацкі ўзровень работы;
- арыгінальнасць ідэі;
- цэласнасць кампазіцыйнага рашэння;
- тэхніка выканання;

- спалучэнне традыцый беларускага нацыянальнага мастацтва і сучасных тэндэнцый культуры.

7. Аргкамітэт Конкурсу

Аргкамітэт Конкурсу ажыццяўляе збор заявак і конкурсных работ, асвятленне вынікаў конкурсу, забяспечвае размяшчэнне фотаздымкаў конкурсных работ на афіцыйных сайтах.

8. Падвядзенне вынікаў і ўзнагароджанне пераможцаў

Падвядзенне вынікаў Конкурсу і вызначэнне пераможцаў ажыццяўляе журы (дадатак 2). Па кожнай намінацыі вызначаюцца лаўрэаты I, II, і III ступені. Пераможцы ўзнагароджваюцца дыпломамі і памятнымі прызамі.

Вынікі галасавання гледачоў і прозвішчы пераможцаў Конкурсу будуць апублікаваныя ў сацыяльных сетках.

Конкурсныя работы лаўрэатаў I, II, III ступені не вяртаюцца аўтарам і застаюцца ў выставачнай экспазіцыі цэнтра рамёстваў «Спадчына».

Па пытаннях арганізацыі і правядзення конкурсу звяртацца па тэлефонах 8(0152) 68 38 20, 68 38 21, 68 38 23, + 37544 7440883 або на адрас электроннай пошты gr.nasledie@mail.ru

Дадатак 1

СКЛАД АРГКАМІТЭТА
адкрытага гарадскога конкурсу
дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Велікодная вярба»

Чыкун Марына Генрыхаўна – загадчык філіяла «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Шыдлоўская Алена Пятроўна – навуковы супрацоўнік філіяла «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Маліноўская Алена Аляксандраўна – кіраўнік народнага аматарскага аб'яднання майстроў народнай творчасці і мастакоў «Гарадзенскі каларыт».

Кандратава Алена Мікалаеўна – кіраўнік студыі філіяла «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Кірко Наталля Аляксандраўна – кіраўнік студыі філіяла «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Дадатак 2

ЗАЯЎКА

на ўдзел у адкрытым гарадскім конкурсе
дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Велікодная вярба»

1. Прозвішча, імя, імя па бацьку_____
2. Дата нараджэння_____
3. Месца пражывання, кантактны тэлефон _____
4. E – mail:_____
5. База дзейнасці (установа культуры, навучальная ўстанова, іншае)_____
6. Работы, прадстаўленыя на конкурс:

№ п/п	Намінацыя	Назва работы	Тэхніка і матэрыялы выканання
1.			

Подпіс _____/_____/
расшыфроўка подпісу

Дадатак 3

СКЛАД ЖУРЫ
адкрытага гарадскога конкурса
дэкаратыўна-прыкладной творчасці «Велікодная вярба»

Ерэміновіч Галіна Міхайлаўна - намеснік начальніка аддзела культуры Гродзенскага гарадскога выканаўчага камітэта.

Кавалёнак Дамініка Дамінікаўна – Народны майстар Рэспублікі Беларусь, лаўрэат прэміі А.І. Дубко.

Мазепа Наталля Аляксандраўна – намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Палчанкова Святлана Паўлаўна – намеснік дырэктара дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Пятровіч Ульяна Рыгораўна – начальнік аддзела метадычнай працы дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Міклашэвіч Ірына Уладзіміраўна – галоўны рэжысёр рэжысёрска-пастановачнага аддзела дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Чыкун Марына Генрыхаўна – загадчык філіяла «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры».

Шыдлоўская Алена Пятроўна – навуковы супрацоўнік філіяла «Цэнтр рамёстваў «Спадчына» дзяржаўнай установы «Гродзенскі гарадскі цэнтр культуры»